# ВЕРАСНЁЎСКАМУ ПОЛЮ—НАШ КЛОПАТ!

- Усё, што вырашчана, убраць без страт!
- Уборцы «другога хлеба» — максімум увагі!
- Норма: вышэй нормы!
- Кожны дзень — ударны!

**На палях рэспублікі працягваецца бітва за ўраджай. Ідзе церабленне і абмалот ільну, уборка грэчкі, гароху, іншых зернебабовых культур. На таках даводзіцца да ладу намалочанае збожжа, засыпаецца на насенныя мэты, адпраўляецца дзяржаве... Спраў у сельскага працаўніка цяпер шмат. І вялікую дапамогу вёсцы ў гэтыя гарачыя дні павінны аказаць мы, студэнты і супрацоўнікі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна.**

**На працягу некалькіх дзён з перона чыгуначнага вакзала адыходзілі цягнікі з тымі, хто сёння ўжо руплва працуе на вясковых палетках. Сёлета, як і ў мінулым годзе, студэнты арганізаваны па прынцыпу будаўнічых атрадаў. У кожным ёсць камандзір, камісар. Каардынуюць дзеянні атрадаў занальныя штабы.**

**Галоўны наш клопат — уборка бульбы. У рэспубліцы «другі хлеб» займае 375 тысяч гектараў. Як відаць, плошча даволі значная, і каб своечасова, без страт выкапаць клубні, трэба літаральна з першага дня ўборкі працаваць па-ударнаму, перавыконваць дзённыя заданні.**

**Кіраўнікі саўгасаў і калгасаў загадзя паклапаціліся — стварылі спрыяльныя бытавыя ўмовы, забяспечылі фронтам работ. Наш абавязак — дабівацца, каб кожны пасланец універсітэта, хто прыехаў на дапамогу вёсцы, працаваў шчыра, добрасумленна, з хлеборобскай руплівасцю і дбайнасцю.**

**Студэнт! Супрацоўнік! Выкладчык! Памятай: важнейшая задача дня — убраць бульбу да апошняга клубня, у самыя аптымальныя тэрміны і без страт!**

**Акрамя выканання вытворчай праграмы належыць шмат зрабіць і ў плане масава-палітычнай работы. Плануецца правесці Тыдзень салідарнасці з моладдзю, якая змагаецца з імперыялізмам. Арганізавана і на высокім узроўні павінны прайсці канцэрты агітбрыгад, выступленні лектарскіх груп.**

**Працоўная восень — сур'ёзны экзамен на сталасць. Вытрымаць яго з гонарам — пярвейшы абавязак кожнага, каму універсітэт даверыў быць на пярэднім краі барацьбы за ўраджай першага года адзінаццатай пяцігодкі.**

**(Матэрыялы аб ходзе сельгасработ чытайце на 2-3 старонках).**

*ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1981
10 ВЕРАСНЯ
ЧАЦВЕР
№ 26 (1326)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

## З ДАПАМОГАЙ ГПК

**Знаёмства з універсітэтам, факультэтам, будучай спецыяльнасцю ў цяперашніх першакурснікаў адбылося значна раней, калі яны былі яшчэ абітурыентамі. У гэтым ім вельмі дапамагла грамадская прыёмная камісія БДУ імя У. І. Леніна. У яе састаў уваходзілі 45 чалавек — лепшыя студэнты, камсамольскія актывісты. Колькі факультэтаў у БДУ, якія прадметы вывучаюць на кожным, каго рыхтуюць яны — на гэтыя пытанні адказвалі члены ГПК, праводзячы вялікую прафарыентацыйную работу. Для рабочай і вучнёўскай моладзі, было прачытана 125 лекцый аб БДУ, праведзены «Дні адкрытых дзвярэй» на факультэтах, разаслана больш чым 5000 буклетаў даведачна-інфармацыйнага матэрыялу ў сельскія і гарадскія школы рэспублікі, падрыхтаваны і выпушчаны спецыяльныя маляўнічыя насценгазеты «Абітурыенту-81».**

**Увесь ліпень адным з асноўных участкаў работы грамадскай прыёмнай камісіі было афармленне дакументаў. Штодзённа члены ГПК прадстаўлялі ў прыёмную камісію звесткі аб паданых заявах, на дошку аб'яў вывешвалі інфармацыю.**

**Звесткі аб парадку здачы ўступных экзаменаў, паступленні ва універсітэт, уладкаванні ў інтэрнат і на кватэры, а таксама па пытаннях працаўладкавання і паступлення на падрыхтоўчае аддзяленне універсітэта юнакі і дзяўчаты маглі атрымаць, звярнуўшыся у арганізаваны камісіяй «Стол даведак».**

**Вялікую ўвагу члены ГПК удзялялі стварэнню добрых умоў для абітурыентаў у перыяд здачы экзаменаў. Усе іншагароднія паступаючыя былі паселены ў інтэрнаты, дзе было наладжана дзяжурства членаў камісіі, арганізаваны спецыяльныя пункты, у якіх абітурыенты маглі атрымаць кансультацыі па вывучаемых прадметах.**

**Значную работу правяло бюро па працаўладкаванню, якое ў падрыхтоўчы перыяд займалася зборам звестак аб прафесіянальна-тэхнічных вучылішчах, колькасці паданых заяў і льготах для паступаючых. Абітурыенты, якія не здалі ўступных экзаменаў, ці не прайшлі па конкурсу, маглі атрымаць накіраванні на камсамольскія ўдарныя будоўлі, у вучылішчы і тэхнікумы.**

**Дакладная, наладжаная работа членаў грамадскай прыёмнай камісіі дапамагла абітурыенту адчуць сябе паўнапраўным членам вялікай універсітэцкай сям'і, сарыентавацца ў патоку інфармацыі, сканцэнтраваць сваю ўвагу на галоўнай мэце.**

**Т. СОТЧАНКА,**
**старшыня грамадскай прыёмнай камісіі.**

**ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАЙ**

# РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ

## ПЕРААДОЛЕЦЬ СЯБЕ



**ТАЦЦЯНА ІВАНАЎНА ПРЫТЫЦКАЯ. Закончыла Кіеўскі дзяржаўны універсітэт імя Т. Шаўчэнкі, ВПШ пры ЦК КПСС, аспірантуру БДУ імя У. І. Леніна. Працавала на партыйнай рабоце. З 1968 года — загадчыца кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў БДУ імя У. І. Леніна, прафесар. Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджана ордэнам «Чырвонай Зоркі», медалямі. За дасягнутыя поспехі ў выкананні заданняў дзесятай пяцігодкі па падрыхтоўцы спецыялістаў для народнай гаспадаркі ўзнагароджана ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі.**

— Чалавек не павінен спыняцца на дасягнутым. Любую справу, вялікую ці малую, неабходна даводзіць да канца. Бяда многіх з нас як раз у тым і заключаецца, што мы шмат абяцаем, а вось стрымліваем слова не заўсёды. Дзеля дасягнення жаданай мэты неабходна пераадолець сябе...

Іменна так вызначае сваю жыццёвую пазіцыю загадчыца кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў прафесар Таццяна Іванаўна Прытыцкая.

Займаючыся ў Кіеўскім дзяржаўным універсітэце, Т. І. Прытыцкая ўзначальвала камсамольскую арганізацыю факультэта. Вучылася сама, дапамагала іншым. Яшчэ студэнткай закончыла школу снайпераў. Час быў тады такі, грозны, перадваенны.

Вайна выпрабоўвае людзей на злом, ставіць у самыя нечаканыя сітуацыі, правярае маральную стойкасць і грамадзянскую сталасць. Таццяна Іванаўна выканала свой абавязак перад Радзімай. Па асабістай просьбе ЦК ВЛКСМ накіроўвае яе ў тыл ворага інструктарам. У 17 партызанскіх атрадах Віцебскай вобласці давялося пабываць камсамолцы. Яна дапамагала арганізоўваць камсамольскія сходы, канферэнцыі, прымала ўдзел у агітацыйнай рабоце. Дзень Перамогі сустрэла ў дзеючай арміі лейтэнантам-палітработнікам.

Потым была вышэйшая партыйная школа пры ЦК КПСС, праца ў Гродзенскім і Маладзечненскім ГК партыі, а з 1950 года — яна ў БДУ імя У. І. Леніна.

На кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў вядзецца вялікая вучэбная, навуковая і палітыка-выхаваўчая работа. За апошнія 10 гадоў на кафедры падрыхтавана і абаронена 34 кандыдацкія і 4 доктарскія дысертацыі. І ўсё гэта не без непасрэднага ўдзелу Т. І. Прытыцкай. Вось што гаворыць пра яе А. Н. Захватаева, парторг кафедры:

— Таццяна Іванаўна — выдатны педагог, метадыст, вопытны выкладчык. Напрамак яе навуковай дзейнасці звязаны з распрацоўкай праблемы марксісцка-ленінскага вучэння аб партыі. А гэта тэма складаная, патрабуе тытанічнай працы.

**А. ЛАЗОЎСКІ.**

## ПАЎТАРЫЦЦА Ў ВУЧНЯХ



**МІКАЛАЙ ТАРАСАВІЧ РАМАНОЎСКІ. Нарадзіўся ў 1912 годзе. Закончыў інстытут народнай гаспадаркі імя В. Куйбышава, займаўся ў аспірантуры БДУ імя У. І. Леніна. З 1947 года — дэкан геаграфічнага факультэта, загадчык кафедры эканамічнай геаграфіі замежных краін, прафесар. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны ІІ ступені, ордэнам «Чырвонай Зоркі», шасцю медалямі. За дасягнутыя поспехі ў выкананні заданняў дзесятай пяцігодкі па падрыхтоўцы спецыялістаў для народнай гаспадаркі ўзнагароджаны ордэнам Дружбы народаў.**

— Магчыма, гэта фраза — традыцыйная. Аднак, паверце на слова, што мая ўзнагарода — вынік працы ўсяго калектыву. Кожнага выкладчыка, лабаранта, студэнта...

Такім быў адказ дэкана геаграфічнага факультэта, прафесара М. Т. Раманоўскага на пытанне «Як Вы аднесліся да ўзнагароды?». І ў шчырасці яго слоў пераконваецца не прыйшлося, бо за той непрацяглы час, які Мікалай Тарасавіч здолеў нам адвесці, ён стараўся скіраваць размову на універсітэт, на сённяшняе жыццё факультэта, на яго заўтрашні дзень. Расказваў пра тое, што геаграфічная навука ўзнялася на новы, больш высокі ўзровень, што без географа сёння не могуць абысціся ні навукова-даследчы інстытут, ні будаўнічая ці турысцкая арганізацыя... Здавалася, ён хацеў разбіць той устойлівы стэрэатып спецыяліста з геаграфічнай адукацыяй, які склаўся ва ўяўленні большасці з нас: школа і настаўнік-географ з нязменнымі атрыбутамі — глобусам і ўказкай.

— А што датычыць спецыяльнасці «выкладчык геграфіі», дык яна і цяпер з'яўляецца вядучай на факультэце. 40—45 працэнтаў нашых выпускнікоў кожны год ідуць працаваць у школы. І працуюць выдатна.

Сапраўды, дэкану ёсць чым ганарыцца, аб чым расказваць. Учарашняга выпускніка геаграфічнага факультэта можна сустрэць у розных кутках нашай Радзімы: у школах, установах, у геалагічных партыях.

У яго шмат вучняў і прадаўжальнікаў. Заклік «настаўнік, выхавай вучня, каб было ў каго вучыцца» стаў для М. Т. Раманоўскага самім жыццём. Ці не таму першымі, хто павіншаваў яго з узнагародай, былі яго вучні — акадэмік АН БССР Ф. С. Марцінкевіч, доктар эканамічных навук В. Ф. Мядзведзеў, прафесар В. Ф. Якушка.

**А. ФАМІЧОЎ.**







## СЛОВА ПРА КАМАНДЗІРА

# Першая раніца

НА ФАКУЛЬТЭЦЕ Зінаіду Несцераўну Панцялееву ахарактарызавалі чалавекам абавязковым. А калі, як не ў час сельскагаспадарчых работ, якасць гэта праяўляецца найбольш яскрава? Супрацоўніца кафедры геадэзіі і картаграфіі не ўпершыню побач са студэнтамі на традыцыйных восеньскіх выпрабаваннях прац. І таму многія пытанні арганізацыі работы і быту ССГА прадуманы ёю раней.

Наш састаў даўно ўжо памінуў граніцу Магілёўшчыны і Міншчыны. Хутка і пункт прызначэння. Географы-трэццякурснікі прыпамінаюць па маёй просьбе папярэднія сельгасработы, праведзеныя тут, на палях Шклоўскага раёна.

Валя Сцефановіч расказвае, як было арганізавана сацспаборніцтва паміж брыгадамі, аб выніках якога паведамлялі штодзённыя «маланкі»; як у вольны час студэнты рыхтаваліся да канцэртаў мастацкай самадзейнасці, з якімі выступалі перад мясцовымі жыхарамі. Сама Валя—пастаянная ўдзельніца такіх канцэртаў і прызнаная салістка.

А якія насценгазеты выпускала Ірына Ягорцава! Якія вечары сучаснай народнай музыкі арганізоўвалі Генадзь Русціновіч і Сяргей Зіноўка! Якія дыскатэкі праводзіў Віктар Грыгарчук!

Такім чынам, вопыт назапашаны немалы. Зінаіда Несцераўна, як і яе студэнты, упэўнена, што лепшыя мінулагоднія традыцыі аднавяцца і сёлета...

Пасля ўрачыстай сустрэчы на Шклоўскім вакзале, пасля мітынгу, дзе выступіла першы сакратар раённага камітэта партыі В. Ф. Кастэнка з расказам аб справах і дасягненнях працаўнікоў раёна і заклікам да студэнтаў старанна дапамагчы ва ўборцы ўраджаю, камандзіры студэнцкіх сельскагаспадарчых атрадаў знаёмяцца з кіраўнікамі калгасаў.

Першая сустрэча, першы кантакт — своеасаблівы аванс будучых дзелавых зносін. Заўважаю пільны позірк Зінаіды Несцераўны, калі яе і камісара атрада, малодшага навуковага супрацоўніка лабараторыі меліярацыі ландшафтаў Яраслава Канстанцінавіча Кулікова, прадстаўляюць старшыні калгаса «Шлях да камунізму» Мікалаю Елісеевічу Кавалеўскаму.

І вось ужо рушылі па размытых штодзённымі дажджамі палявых дарогах машыны са студэнтамі. У нашым аўтобусе пачэснае месца побач з шафёрам займае гітара. Які без яе атрад!

На жаль, у вёсцы Вялікія Лозіцы, цэнтры калгаса, нельга размясціць 26 чалавек (а гэта ўсяго трэцяя частка атрада). Палова з іх ад'язджае ў суседняе Зацішша. Гэта дабаўляе клопатаў камандзіру. Перш-наперш, нягледзячы на вячэрні час, трэба ўпэўніцца, што іх добра ўладкавалі.

Змяняючы дарожныя туфлі на высокія гумавыя боты, Зінаіда Несцераўна распытвае хатнюю гаспадыню аб карацейшых дарогах да суседніх вёсак. Колькі кіламетраў у дзень прыдзецца вымяраць гэтым боцікам?

Спраўдзілася камандзірскае прадчуванне — некалькі бытавых пытанняў у Зацішшы патрабавалі неадкладнага вырашэння. Пакуль перагаварылі з мясцовым брыгадзірам, пакуль паглядзелі, дзе і як размясціліся дзяўчаты, акрайчык чырвонага сонца за бярозавым пералескам закрыла нізкая хмара. Сцямнела. І напэўна таму дарога назад, у Вялікія Лозіцы, здаецца больш доўгай.

Зінаіда Несцераўна ўпэўнена крочыць па вузенькай сцежцы, раз-пораз націскаючы на кнопку маленькага ліхтарыка, і расказвае аб сваіх трэццякурсніках, якіх добра ведае, бо выязджала з імі на практыку; успамінае ўмовы жыцця і працы ў час мінулых сельгасработ; плануе, што абавязкова трэба зрабіць і высвятліць заўтра, у першы пасля прыезду, бадай, самы складаны дзень.

Імкнучыся не саступіць з бягучага кола святла на цёмную невядомасць дарогі, я пра сябе разважаю аб тым, што нездарма ўсё ж слова «камандзір» — мужчынскага роду. Не так проста жанчыне, які б не быў у яе характар, несці штодзённа цяжар арганізацыйных камандзірскіх турбот і абавязкаў: патрабаваць, вырашаць, прадугледжваць, адказваць, а калі прыдзецца — і кулаком па стале стукнуць. Але, з другога боку, такія неабходныя кіраўніку якасці, як уважлівасць і назіральнасць, чуласць, ветлівасць, клапатлівасць, уласцівы жанчыне больш. Можа, іменна таму трэццякурснікі ставяцца да свайго камандзіра неяк беражліва і паважліва, як да добрага старэйшага сябра. І мне раптам здалося, што ў назве атрада «Арніка», якая пасля доўгіх абмеркаванняў і спрэчак перамагла ў конкурсе на лепшую назву, — даніна прызнання камандзіру-жанчыне. Арніка—рэдкая, прыгожая лекавая расліна, якая занесена зараз у Чырвоную кнігу.

Раніцой, яшчэ да снядання, спяшалася Зінаіда Несцераўна на нараду да старшыні. Дзе сёння будуць працаваць студэнты? Хто і калі правядзе з імі інструктаж па тэхніцы бяспекі? Як будзе арганізавана харчаванне?

Высвятляецца, што адразу пасля нарады Мікалай Елісеевіч едзе ў суседнюю брыгаду, дзе размешчана адна са студэнцкіх груп і, зразумела, камандзір не ўпускае такую выдатную магчымасць!

Праз якую гадзіну камандзір «Арнікі» — на інструктажы. Потым бачу, як спрытна Зінаіда Несцераўна ўзнімае лён побач з дзяўчатамі. А вось яна на выпадковай машыне пад'язджае зноў да праўлення...

**Т. САХАШЧЫК,**
**наш кар.**

Шклоўскі раён.

# ПРАЦАВАЦЬ ЗЛАДЖАНА,

# ЗВАРОТ

### ССГА 1 КУРСА ФІЗІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

**РЭАЛІЗАЦЫЯ аграрнай палітыкі КПСС на сучасным этапе стала сапраўды ўсенароднай справай. Ударную працу паказваюць на палях і фермах юнакі і дзяўчаты. Байцы ССГА 1 курса фізфака на атрадным зборы на месцы работы прынялі рашэнне ўбраць 3000 тон бульбы, з якой 1000 тон забуртаваць; не дапусціць ніводнага выпадку парушэння працоўнай дысцыпліны і тэхнікі бяспекі.**

**Натхнёныя рашэннямі XXVI з'езда КПСС, выконваючы ўказанні таварыша Л. І. Брэжнева аб ператварэнні жывёлагадоўлі ва ўдарны фронт на сяле, мы абавязуемся адпрацаваць два ўдарныя дні ў дапамогу фермам і адзін дзень у фонд Міру. У працоўны перыяд мы абавязуемся даць 4 канцэрты, прачытаць 10 лекцый, правесці 7 спартыўных мерапрыемстваў, 8 сустрэч і вечароў дружбы, добраўпарадкаваць магілы тых, хто загінуў у баях за Радзіму.**

**Заклікаем усе атрады Быхаўскага раёна падтрымаць нашу ініцыятыву — «Ураджаю 1981 года — увагу і клопат ССГА», унесці канкрэтны ўклад у выкананне задач, якія паставіла партыя перад працаўнікамі сельскай гаспадаркі**

*Зварот прыняты на сходзе байцоў ССГА «Дружба» 5 верасня 1981 года.*

● **ДАЕШ РЭКОРД!**

# НА ЛЕПШЫХ ТРАДЫЦЫЯХ

**«АТРАД ЗАКЛІКАНЫ ВЫХОЎВАЦЬ СТУДЭНТАЎ У ДУХУ КАЛЕКТЫВІЗМУ І КАМУНІСТЫЧНЫХ АДНОСІН ДА ПРАЦЫ, ФАРМІРАВАЦЬ ВЫСОКІЯ МАРАЛЬНЫЯ ЯКАСЦІ, ІДЭЙНУЮ СТОЙКАСЦЬ, ПАЧУЦЦЁ САВЕЦКАГА ПАТРЫЯТЫЗМУ І ПРАЛЕТАРСКАГА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗМУ».** *(Са Статута СБА).*

Наташа ШАРЫНА дамывала посуд—работа сама па сабе доўгая і нудная, а калі ўлічыць, што накарміць трэба ні многа, ні мала—75 чалавек, тры разы ў дзень, ды пасля кожнага—міска, лыжка, чашка...

Але вось з-за стала ўзнялася апошняя група дзяўчат:

— Дзякуй паварам, цудоўны абед.

— Малайцы, дзяўчаткі, усё было на «выдатна».

— Дзякуй!

І заўсміхаліся Наташа і Аня Чыркевіч, трэццякурсніцы беларускага аддзялення. І стомленасць стала быццам крыху меншай. Да таго ж зараз, хвіліну адпачыўшы пасля поля, прыбягуць сюды на кухню аднакурсніцы —дапамагчы.

Абед сёння быў пазней, чым звычайна. Дзяўчаты з рускага аддзялення затрымаліся на рабоце—хацелася закончыць усё поле. Учора і сёння трэба было ўзняць лён.

— А заўтра пачнем яго вязаць,—гаворыць, адкінуўшы ўбок непаслухмяныя валасы, брыгадзір Зіна Субота.—Норма—250 снапоў на чалавека. Не так ужо і мала.

— А як спраўляліся з папярэдняй работай?

— Падлічыце: кожнаму—30 сотак. Учора узнялі 8,5 гектара, сёння—больш за 12. А ў брыгадзе ўсяго 19 дзяўчат.

Не трэба рабіць асабліва складаных падлікаў, каб зразумець, што норму філолагі перавыканалі ўжо ў першы дзень работы, а сёння перакрылі яе больш, чым удвая.

А як справы ў сяброўак?

Брыгада Алены Трафімчык у першы дзень работы ўзняла 7,5 гектараў, на другі—11,2. Таксама нядрэнна. Але ў Лены брыгада крыху большая па колькасці байцоў.

Атрад трэццякурснікаў рускага і беларускага аддзяленняў размясціўся на тэрыторыі сярэдняй школы вёскі Камсенічы, што ў Круглянскім раёне. Пад часовыя інтэрнаты пераабсталявана некалькі школьных памяшканняў. Роўныя рады ложкаў запоўнілі вялікія пакоі. Праўда, на сценах пакуль яшчэ толькі школьныя прыстасаванні. Атрадныя плакаты з'явяцца тут крыху пазней.

— Нас вельмі гасцінна сустрэлі,—расказвае Аляксандр Якубчык, студэнт беларускага аддзялення.—Першы дзень работы пачаўся ўрачыстай лінейкай прама тут, у школьным двары. Выступіў старшыня калгаса «Шлях Леніна» Вячаслаў Канстанцінавіч Шафранскі, пазнаёміў з будучай работай.

Філолагі раздзелены на пяць брыгад: чатыры з іх «мясцовыя»—дзяўчаты працуюць на льняных палях. Адна—выязная. Яе складаюць прадстаўнікі «моцнага» полу. Рабяты кожны дзень ездзяць у раённы цэнтр Круглае і заняты разгрузачнымі работамі на льнозаводзе. Брыгадзір у іх—Анатоль Андрэеў, студэнт рускага аддзялення.

Атраду, можна сказаць, пашанцавала. Большасць байцоў жыве разам. Пасяліць атрад такім чынам можа далёка не кожны калгас. Ды і тут жывуць разам толькі дзве брыгады рускага аддзялення, трэццякурсніцы беларускага размеркаваны па кватэрах. І ўсё ж магчымасцей для развіцця традыцый летніх будаўнічых атрадаў тут значна больш. Гэта паказалі ўжо першыя дні сельгасработ.

**Т. АЛЯКСАНДРАВА,**
**наш кар.**

Круглянскі раён.







# РЫТМІЧНА, ПА-УДАРНАМУ!

## «Ой, сэрца, лянок...»



НЕ ТАК ПРОСТА расказаць пра свой атрад, калі ты камісарам усяго другі дзень. Але я паспрабую.

Галоўная складанасць для мяне ў тым, што ў гэтым годзе ўпершыню на нашым факультэце сельскагаспадарчыя атрады фарміраваліся па кафедрах. Гэта значыць, што ў кожны з іх увайшлі групы з усіх курсаў — ад першага да чацвёртага. Звычайна добра ведаеш толькі сваю групу, а тут трэба ведаць усе.

Знаёмілася спачатку з першакурснікамі. Для многіх умовы жыцця і працы нязвыклыя. Трэба нешта падказаць, падтрымаць. Не забылася яшчэ, як сама была на першым курсе, як упершыню нам давялося ўбіраць лён. Быццам бы і ўсё правільна робіш, але сноп атрымоўваецца то вялікім, то маленькім, а як паставіш—тут жа рассыпаецца.

Сёння мы ўзнімалі лён і вязалі снапы. Ну і, зразумела, ветэраны-старшакурснікі ўзялі шэфства над пачаткоўцамі, таму нашым першакурснікам было крышачку лягчэй, чым у свой час нам. Яны ў нас вясёлыя і актыўныя. Дарэчы, назву атрада «Верасень» прапанавалі яны. Усім спадабалася.

Увогуле мы вельмі задаволены прынцыпам арганізацыі кафедральных атрадаў. Ужо паспелі перазнаёміцца і пасябраваць.

Да таго ж, рабяты ў нас выдатныя, хоць іх і вельмі мала. Уважлівыя. Калі мы рассяляліся па кватэрах — дапамагалі дзяўчатам пераносіць рэчы. Нам было вельмі прыемна.

Для многіх прыклад — чацвёртакурсніцы. Яны амаль усе разам у мінулым годзе працавалі ў будаўнічым атрадзе. І зараз правілы і традыцыі СБА уносяць у наш ССГА.

Што датычыцца работы, то па дагавору мы амаль увесь час будзем працаваць на льне. Толькі ў самым канцы дапаможам калгасу ўбіраць буракі. Ведаем, што льном тут засеяна плошча ў 400 гектараў. Амаль усё гэта давядзецца ўбраць атраду. Наша першае поле — 117 гектараў. І мы ўжо падлічваем за колькі дзён з ім справімся.

Ёсць пакуль маленькія бытавыя няўвязкі: ежу нам першыя дні возяць прама на поле. Але ў самым хуткім часе становішча выправіцца. Ужо выдзелена памяшканне, якое стане сталовай і клубам. Падрыхтаваны плакаты для яго афармлення.

Мы былі сёння разам з камандзірам атрада, старшым выкладчыкам кафедры агульнага праграміравання Уладзімірам Пятровічам Нягодай у праўленні калгаса, у мясцовай школе і бібліятэцы. Абяцаюць выдзяліць шашкі і шахматы, дазволілі арганізаваць выязную бібліятэку — кнігі я сама падбяру. Будуць дастаўляць свежыя газеты. Так што палітінфармацыі плануем праводзіць кожны дзень.

Акрамя таго, у бліжэйшых планах — выступленні атраднай агітбрыгады перад тутэйшымі жыхарамі і школьнікамі. Калгас «Маяк» вось ужо некалькі год запар — пастаяннае месца дыслакацыі атрадаў ФПМ. Вось мы і паставілі мэту лепей пазнаёміцца, падрабязней расказаць пра сябе, пра факультэт, пра універсітэт увогуле.

Заўтра на камсамольскім сходзе абмяркуем і прымем план работы на ўвесь верасень. Думаю, для кожнага з байцоў нашага зводнага ССГА знойдзецца справа па душы.

**І. ОСТАНЕН,**
**камісар ССГА «Верасень».**
Шклоўскі раён.

**НА ЗДЫМКАХ: у руках чацвёртакурсніц лянок паслухмяны; прыемнага апетыту!**





## ТЭЛЕТАЙП ВОСЕНІ

УЛІЧВАЮЧЫ асаблівасці ўборкі ўраджаю сёлетняга года, фізічны факультэт, мабілізуючы ўсе рэзервы, накіраваў на сельгасработы ў Быхаўскі раён Магілёўскай вобласці 450 студэнтаў, замест 400 як планавалася. З іх сфарміравана 8 атрадаў, якія працуюць у калгасах «Рэвалюцыя», імя Дзяржынскага, «Ленінскі шлях», імя К. Лібкнехта, «Перамога» і саўгасах «Спадарожнік», «Ямнае», «Усход».

Фронт работ студэнтам цалкам забяспечаны. Яны ўбіраюць яблыкі, буракі, моркву, лён, працуюць на зер647складах і зернетаках. У некаторых гаспадарках пачалі капаць бульбу.

Ва ўсіх атрадах праведзены інструктаж па тэхніцы бяспекі. Умовы жыцця і працы ў студэнтаў добрыя.

**Я. УШАКОЎ,**
**намеснік дэкана фізфака.**

* * *

ДА ЎБОРКІ льну на палях Круглянскага раёна Магілёўскай вобласці прыступілі сельскагаспадарчыя атрады філалагічнага факультэта. Яны працуюць у калгасах «Шлях да камунізму» (камандзір А. М. Лемешаў, выкладчык кафедры рускай класічнай літаратуры), «Рассвет» (камандзір Г. Р. Налівайка, выкладчыца кафедры французскай і іспанскай мовы), «Шлях Леніна» (камандзіры Г. В. Пальцаў, выкладчык кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства і І. В. Жук, асістэнт кафедры беларускай літаратуры), а таксама ў саўгасе «Круча» (камандзір М. М. Круталенка, аспірант кафедры беларускай мовы).

**М. ПІПЧАНКА,**
**намеснік дэкана філфака.**

* * *

577 пар працоўных рук студэнтаў механіка-матэматычнага факультэта прынялі калгасы і саўгасы Чавускага раёна Магілёўскай вобласці. Сельскагаспадарчыя атрады працуюць у 13 гаспадарках. Шэсць з іх—калгасы «1 Мая», «Ленінскі шлях», «Ільіча», «Зара», «Зорка» і саўгас «Асіноўскі»—сталі месцам дыслакацыі ССГА першакурснікаў, для якіх сельгасработы стануць першым выпрабаваннем у студэнцкім жыцці, своеасаблівым экзаменам на сталасць.

Станаўленне студэнцкіх калектываў, як правіла, адбываецца ў працы. Пасля такой праверкі студэнты лепш ведаюць адзін другога, мацней сябруюць. Камандзірамі атрадаў першакурснікаў прызначаны: старшы выкладчык кафедры алгебры М. М. Талкачоў, дацэнт кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў В. І. Громак, асістэнт кафедры лічбавых метадаў і праграміравання М. А. Аленскі, асістэнт кафедры геаметрыі У. В. Сувораў, а таксама старшыя выкладчыкі кафедры фізвыхавання М. Т. Бязручанка і У. С. Мурашоў.

Старшакурснікі выехалі на «бульбу», узброеныя вопытам ССГА мінулых гадоў.

**С. ІВАНОВА.**



Рытмы трэцяга семестра. Фота С. ШУШКЕВІЧА.

# УДАРНЫЯ ТЭМПЫ ЛЕТА

### НЕКАЛЬКІ МОМАНТАЎ ДЗЕЙНАСЦІ ЛОУХСКАГА ЗАНАЛЬНАГА АТРАДА

**АДНОЙ** з цікавых форм работы з мясцовым насельніцтвам з'явіўся агітпрабег па тэрыторыі Беламорскага раёна. Яго ініцыятары — байцы будатрада імя П. Купрыянава. Разам з імі ў агітпрабегу прымаў удзел СБА «Беларусь». Разнастайнасцю вызначалася праграма агітпрабегу: шматлікія лекцыі, канцэрты, шэфская дапамога школам, ветэранам вайны і працы.

**ЦЕСНЫЯ** сувязі звязвалі байцоў атрада «Кастрычнік» з Саветам ветэранаў горада Кемі. Сумесна правялі паход па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы Кемскага раёна. Атрад узяў шэфства над мемарыяльным комплексам героям рэвалюцыі і грамадзянскай вайны.

**УДЗЕЛЬНІЧАЮЧЫ** у аперацыі «Няхай заўжды будзе сонца!», атрад «Ветразь» займаўся добраўпарадкаваннем дзіцячага сада № 92. Усяго байцамі адпрацавана 300 чалавека-гадзін.

**ПРАВЕДЗЕНЫ** рэйд «Прырода» па Беламорскаму каналу. Створаны «Ветразем» клуб падлеткаў па радыёаматарскаму канструяванню дзейнічаў да канца лета.

● ШТРЫХІ ДА ПАРТРЭТА КАМІСАРА

# Вернасць

ЛЕТА ЗАКАНЧВАЛАСЯ. Касцёр сабраў усіх байцоў. Гаварылі аб рабоце, успаміналі, спявалі... Раптам камісар папрасіў увагі. Ён пачаў чытаць. Гэта былі адказы на праведзеную ў атрадзе анкету. На адным з аркушаў паперы быццам «спатыкнуўся», але дачытаў да канца: «Пасаду камісара ў будатрадзе лічу непатрэбнай...». Цішыня ўсталявалася ненадоўга. Перабіваючы адзін аднаго, даказвалі, спрачаліся... Свае думкі выказвалі па-рознаму, аднак ніхто не згаджаўся з прачытаным радком. Даўно разышліся рабяты, а камісар не мог доўга заснуць. Нават калі адзін баец сумняваецца ў патрэбнасці тваёй работы, значыць, ёсць пралікі...

Слава Малафееў памятае пра гэты выпадак, нягледзячы на прайшоўшыя гады. Чацвёртае будатрадаўскае лета ўпісала ў яго біяграфію свае радкі. Прымаючая арганізацыя — ПМК-10 аб'яднання «Пскоўмеліярацыя» — стала надоўга «сваёй». Атраду імя П. Купрыянава перададзены на захаванне вымпел Бежанінскага райкома партыі «Пераможца сацыялістычнага спаборніцтва». Усе тры семестры запар, пачынаючы з 1978 года, утрымоўвалі яго купрыянаўцы.

Карэлія. Беламорская рыбная база. Вось новае месца дыслакацыі атрада імя П. Купрыянава ў сёлетнім семестры. І, як заўсёды, са сваімі байцамі — «нязменны» камісар Слава Малафееў. І зноў атрад сярод лепшых, і па вытворчай дзейнасці, і па грамадска-палітычнай. Як сказаў камісар занальнага штаба Андрэй Клокаў: «У гэтым атрадзе камісарская думка пульсуе па-асабліваму». І ёсць пацверджанне яго словам. СБА імя Купрыянава — ініцыятар агітпрабегу па Лоухскай зоне.

Зараз рыхтуецца справаздача. Як уся вытворчая праграма будатрада набывае на аркушах справаздачы канкрэтнасць акрэсленай сумы асваення, так і ідэалагічны бок здзіўляе вялікай колькасцю канцэртаў, лекцый і яшчэ мноствам самых разнастайных спраў.

Застаецца толькі дадаць, што за актыўны ўдзел у будатрадаўскім руху, вернасць СБА, студэнт IV курса радыёфізічнага факультэта Вячаслаў Малафееў узнагароджаны медалём «За працоўную адзнаку».

**М. ЛАХВІЧ.**

**УПЕРШЫНЮ МЕСЦАМ ДЫСЛАКАЦЫІ УНІВЕРСІТЭЦКІХ АТРАДАЎ СТАЎ СТАЎРАПОЛЬСКІ КРАЙ. АДНАК ГЭТА НЕ ПЕРАШКОДЗІЛА ПРАДОЎЖЫЦЬ СЛАЎНЫЯ ТРАДЫЦЫІ СБА БДУ, ЗАРЭКАМЕНДАВАЦЬ СЯБЕ ТОЛЬКІ З ЛЕПШАГА БОКУ.**

# З адзнакай «выдатна»

ВЕТЛІВА сустрэла Стаўрапалле прадстаўнікоў Беларусі — дваццаць студэнцкіх атрадаў з розных ВНУ горада Мінска. У іх ліку і шэсць атрадаў з Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

Шэсць атрадаў — гэта каля трохсот байцоў з пяці факультэтаў. Усе яны дыслацыраваліся ў Ізабільненскім раёне. Праполка і ўборка гародніны ў саўгасе «Цішчанскі», перапрацоўка сельскагаспадарчай прадукцыі ў саўгасе «Каўказ», зернетакі вопытнай гаспадаркі «Ізабільненскі» — асноўныя аб'екты. Працавалі добра, старанна, значна перавыконваючы дзённыя заданні. Асабліва стараліся байцы атрадаў «Стэлуца» мехмата, «Купалінка» хімфака, «Спадчына» юрфака.

Усяго за час працоўнага семестра-81 атрадамі Белдзяржуніверсітэта сабрана 1225 тон гародніны, выраблена 1 мільён 788 тысяч слоікаў кансерваў, сабрана і перапрацавана сельскагаспадарчай прадукцыі на агульную суму 153 тысячы рублёў. А за тры Дні ўдарнай працы пералічана 4378 рублёў.

Не толькі выдатнай працай славіліся байцы студэнцкіх атрадаў. Кожны з іх заўсёды знаходзіў і час, і магчымасць для змястоўнага адпачынку. Так, напрыклад, у СБА «Стэлуца» цікава прайшлі пасвячэнне студэнтаў-навічкоў у байцы будатрада, агеньчыкі. «Спадчына» і атрад імя В. Харужай наладзілі добрыя кантакты з мясцовымі жыхарамі, а байцы атрада імя Машэрава ўзялі шэфства над мясцовым дзіцячым садам. На рахунку СБА Белдзяржуніверсітэта 43 канцэрты, 19 лекцый, актыўны ўдзел у экспедыцыі «Мая Радзіма—СССР», аперацыях «Памяць», «Доўг», шматлікія спартыўныя спаборніцтвы.

Можна смела сказаць, што экзамен на працоўную сталасць вытрыманы на «выдатна».

**Л. ТРЭЦЦЯКОВА,**
**камісар Стаўрапольскага занальнага штаба.**

# Я НЕ ЗАБУДУ ЦЯБЕ, «КУПАЛІНКА»...

КУПАЛІНКА... Ласкавае, пяшчотнае беларускае слова хвалюе кожнага байца нашага атрада. Яно — дарагая часцінка роднага краю, бацькоўскага дому. На гасціннай зямлі Стаўрапалля адчуваеш гэта выразней, імкнешся апраўдаць высокае званне пасланцоў Беларусі.

Атрад актыўна ўдзельнічаў у сацыялістычным спаборніцтве за права называцца лепшым сярод дзевяці СБА, якія дыслацыраваліся ў саўгасе «Цішчанскі». Мы імкнуліся не столькі да высокіх лічбаў, як да якаснага выканання заданняў. Гэта дазволіла атраду ўвесь час быць у тройцы лепшых. Былі такія дні, калі дзённая выпрацоўка на байца даходзіла да 250 працэнтаў. У чым жа сакрэт поспеху?

Я лічу, што, па-першае, гэта працоўная загартоўка, якую атрымалі байцы ў мінулыя гады. Мы абапіраліся на сваіх ветэранаў — Надзею Шыдлоўскую і Лілію Падаляк, якія ўдзельнічалі ў будатрадаўскім руху чацвёрты раз. Яны — прыклад для ўсіх байцоў. Асабліва для тых, хто ўпершыню апрануў будатрадаўскую форму: Ларысы Хоміч, Алега Сапуна, Алены Ерхавей, Генадзя Чабарука. Нельга не ўспомніць нашага брыгадзіра Таццяну Бобрык, якая выконвала ў дзень па паўтары нормы. Дарэчы, гэта пятае працоўнае лета ў яе жыцці. А гэта значыць, што ўменне працаваць ёй не займаць.

Па-другое, «Купалінка» — сапраўдны калектыў, дзе ніхто не адчувае сябе лішнім, не застаецца ў баку ад агульных спраў. Я ўпэўнена, што пасля працоўнага семестра кожны баец будзе гаварыць: «А памятаеш...»

**З. ІВАНОВА,**
**камісар СБА «Купалінка» хімічнага факультэта.**



Апошняя лінейка атрада. Фота В. ШАЧАКА.

# ПРАЦЯГ БІЯГРАФІІ

### СТАРОНКІ З БУДАТРАДАЎСКАГА ДЗЁННІКА

...Хлопцы пад незабыўным уражаннем убачанага. Хаця большасць з нас прыязджае ў Карэлію не першае лета. Край тайгі і азёр не перастае здзіўляць сваёй спрадвечнай прыгажосцю. Таежны гарадок з незвычайнай назвай Кастамукша, куды мы прыехалі на гэты раз, вырас побач з вялікай новабудоўляй краіны — горнаўзбагачальным камбінатам. Ён і з'яўляецца месцам нашай дыслакацыі. Будоўля ўражвае сваімі памерамі, магутнасцю. І людзьмі. Іх энтузіязму, самаадданасці, уменню працаваць можна толькі пазайздросціць. Радасна, што з многімі з іх мы будзем працаваць побач.

***

Што ўяўляе сабой наш СБА імя С. П. Каралёва? Нас — 29. Узрост — самы разнастайны. Самы вядомы атрад на фізічным факультэце універсітэта. Існуем мы ўжо чацвёрты год. Трэці семестр месца пастаяннай прапіскі — будоўлі Карэліі. Мікалай Салановіч — нязменны камандзір. Адна з даўніх традыцый — шэфства ветэранаў атрада над навічкамі.

***

...Пачаўся дождж. Аднак разыходзіцца ніхто і не думаў. Кожны нумар выступлення нашай агітбрыгады і байцоў атрада з Рыгі ўспрымаўся з задавальненнем. Лепш усялякіх пахвал—настойлівыя і гарачыя апладысменты гледачоў. Свята Дня металурга мы адзначалі разам з працоўнымі Кастамукшы. Канцэрт—усяго адзін момант гэтага насычанага падзеямі дня. Шматлікія сустрэчы з ветэранамі працы, вайны, спартыўныя спаборніцтвы па футболу, валейболу — вось няпоўны пералік праграмы свята. На жаль, не ўдалося правесці таварыскі матч па футболу з камандай камбіната. Але ён абавязкова адбудзецца. Час у нас ёсць.

***

У атрадзе прайшоў адкрыты сход. Пагаварыць шчыра і прама аб сваіх клопатах, вольным часе стала неабходнасцю. Рашэнне запрасіць прадстаўнікоў адміністрацыі, парткома, камітэта камсамола аб'яднання «Кастамукшабуд» не было нечаканым. Іменна ад іх намаганняў залежыць у многім і наша вытворчая дзейнасць, і грамадска-палітычная. Мы звярнуліся таксама са сваімі прапановамі наконт павышэння эфектыўнасці працы, уладкавання жылля. Верым, што за іх рэалізацыяй справа не стане. А расказ гасцей аб гісторыі будаўніцтва камбіната, сваім горадзе, яго жыхарах не мог не зацікавіць. На сходзе запланавалі сумесныя мерапрыемствы з мясцовымі камсамольскімі арганізацыямі. Прапанову правесці яшчэ адну падобную сустрэчу ўсе прынялі аднадушна.

***

Быццам зусім нядаўна засяляліся ў новы інтэрнат, з захапленнем знаёміліся з размахам будаўніцтва камбіната, а ўжо завяршаецца месяц нашага знаходжання на карэльскай зямлі. Байцы атрада ўцягнуліся ў работу, стаў прывычным напружаны расклад дня. І часта ў размове пачуеш: «У нас, у Кастамукшы...»

***

Хутка, праз год, асноўная частка нашага атрада атрымае дыпломы маладых спецыялістаў. На жаль, прыходзіцца прызнаць, што мы ўжо на пятым курсе. Толькі паспяваеш зазначыць як імкліва «праносяцца» студэнцкія гады.

У дзень пуску першай чаргі камбіната мы будзем далёка ад Кастамукшы. Але самае важнае тое, што кожны з нашага будатрада будзе адчуваць сваё непасрэднае дачыненне да гэтай вялікай падзеі.

**А. ЛАЎРЫНЕНКА,**
**баец СБА імя акадэміка С. П. Каралёва.**


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

10 верасня 1981 г.

Заказ 1443 АТ 02413

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ